

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН РЭКТАРАТА, ПАРТКОМА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА

№ 30 (154) 18 снежня 1990 года


## У ПАРТЫЙНЫМ КАМІТЭЦЕ

**Адбылося чарговае пасяджэнне партыйнага камітэта універсітэта, на якім зацверджаны наступныя камісіі.**

**Ідэалагічная камісія: старшыня камісіі — І. В. Крэнь, члены камісіі — А. В. Бедакоў, Б. М. Іванчук.**

**Камісія па арганізацыйна-партыйнай рабоце: старшыня камісіі — М. В. Жарскі, члены камісіі — А. С. Балыкін, М. В. Васілючак.**

**Камісія па сувязях з грамадска-палітычнымі арганізацыямі (у тым ліку і з маладзёжнымі): старшыня камісіі — У. А. Нядзелька, члены камісіі — В. В. Малышка, Э. С. Ярмусік.**

**Камісія па пытаннях культуры працы, зносін і быту: старшыня камісіі — Ю. М. Вувунікян, члены камісіі — С. С. Ануфрык, В. П. Гарбачоў, В. К. Бойка, А. М. Пугачоў.**

## ФОРУМ СТУДЭНТАЎ

14-16 снежня 1990 года ў Мінску прайшоў ІІ-гі Рэспубліканскі студэнцкі форум, у ходзе якога было працягнута абмеркаванне праблем удзелу студэнцкай моладзі ў працэсах абнаўлення грамадства, перабудовы народнай адукацыі, падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, дэмакратызацыі жыцця навучальных установ і сацыяльнай абароны студэнтаў, ролі і месца грамадскіх маладзёжных арганізацый у навучальных установах.

У рабоце форума прыняло ўдзел 330 дэлегатаў — студэнтаў і навучэнцаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў рэспублікі, замежныя студэнты, сакратары камітэтаў камсамола і старшыні прафкомаў вышэйшых навучальных устаноў.

**У праграме форума былі:**

— сустрэча дэлегатаў з урадам рэспублікі, старшынямі камісій Вярхоўнага Савета БССР, кіраўніцтвам ЦК КПБ, прадстаўнікамі міністэрстваў і ведамстваў, арганізацый-заснавальнікаў;

— нарада прадстаўнікоў дэлегацый абласцей;

— пленарнае пасяджэнне (зацвярджэнне праграмы, рэгламенту і парадку дня форума, выбары рабочых органаў, прэзідыума, мандатнай камісіі, сакратарыяту і рэдакцыйнай камісіі); работа тэматычных дыскусійных цэнтраў (праблемы перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школы, прапановы ў праект Закона аб народнай адукацыі ў БССР, сацыяльная абарона студэнтаў, роля грамадскіх арганізацый у навучальнай установе) і іншыя.

У рабоце форума прымалі ўдзел і дэлегаты нашага універсітэта:

**Малышка В.**— намеснік сакратара камітэта камсамола,

**Філіпчык В.**— студэнт 3 курса гістарычнага факультэта,

**Холад В.**— студэнт 4 курса факультэта правазнаўства.

У адным з наступных нумароў яны раскажуць аб рабоце форума і падзеляцца сваімі ўражаннямі.

## АБ ´ЯВА

**Беларускі дзяржаўны музей запрашае прыняць удзел у вечарах «Каляды ў кантэксце Еўрапейскай культуры».**

**Пачатак 21 снежня ў 19.00**

**22, 23снежня ў 18.00.**

# Пасылалі запыт у мясцовыя Саветы

**Камітэт камсамола і прафком студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта, занепакоеныя станам сацыяльна-бытавога забеспячэння студэнтаў, месяц назад паслалі запыт у адрас старшынь абласнога і гарадскога Саветаў народных дэпутатаў. У ім, у прыватнасці, гаварылася аб тым, што з года ў год павялічваецца набор студэнтаў на першы курс дзённага навучання, але плошчы, матэрыяльная база, тэхнічнае забеспячэнне універсітэта не адпавядаюць сённяшняму дню. Зацягнута будаўніцтва студэнцкага інтэрната, 68-кватэрнага жылога дома для выкладчыкаў, многія з іх жывуць ва ўмовах, не лепшых, чым студэнты. Ішла размова пра пралікі ў арганізацыі асенніх сельскагаспадарчых работ, пра студэнцкія сталовыя і буфеты.**

**Сёння мы друкуем адказы на гэтае пісьмо, дасланыя з абласнога і гарадскога Саветаў народных дэпутатаў.**

## Абласны Савет народных дэпутатаў паведамляе

На ваш зварот па пытанню нездавальняючага стану сацыяльна-бытавога забеспячэння студэнтаў універсітэта выканаўчы камітэт Гродзенскага абласнога Савета народных дэпутатаў паведамляе, што паднятыя ў ім пытанні разгледжаны ў аблвыканкоме з удзелам кіраўнікоў адпаведных абласных арганізацый і службаў і па іх рэалізацыі намечаны наступныя меры.

Упраўленнем капітальнага будаўніцтва аблвыканкома вырашаецца пытанне аб уключэнні ў план 1991 года задзела будаўніцтва 68-кватэрнага дома для працаўнікоў універсітэта. Канчатковае рашэнне па гэтаму пытанню будзе прынята з улікам паправак па выніках выканання плана капітальнага будаўніцтва за 1990 год.

Будаўніцтва студэнцкага інтэрната не можа быць пачата ў 1991 годзе ў сувязі з тым, што адміністрацыя універсітэта, якая з ´яўляецца заказчыкам па яго праектаванню, пакуль не забяспечыла выраб праектна-каштарыснай дакументацыі. Па звестках, вышэйназваная дакументацыя будзе зроблена ў 1991 годзе, таму пачаць будаўніцтва інтэрната магчыма не раней 1992 года.

Упраўленнем грамадскага харчавання аблвыканкома з удзелам калектыву працаўнікоў студэнцкай сталовай універсітэта разгледжаны прапановы і заўвагі студэнтаў па арганізацыі іх харчавання. Перагледжаны і расшыраны асартымент прыгатоўваемых страў, з мясакамбінатам вырашана пытанне аб першачарговай пастаўцы школьным і студэнцкім прадпрыемствам грамадскага харчавання мясных паўфабрыкатаў. Аддзел па продажу кандытарскіх і кулінарных вырабаў з мэтай пашырэння іх асартыменту пераведзены на работу, як буфет.

Студэнцкаму савету і прафсаюзнаму камітэту універсітэта трэба ўзмацніць са свайго боку кантроль за работай сталовай, а таксама прымаць удзел у бракеражы страў.

Упраўленню гандлю аблвыканкома даручана сумесна з гарвыканкомам ажыццявіць магчымыя меры па паляпшэнню гандлёвага абслугоўвання студэнтаў.

Што датычыцца выдзялення прафкому універсітэта рыначных фондаў на легкавыя аўтамабілі, то вырашыць гэта пытанне аблвыканком не можа ў сувязі з тым, што ў адпаведнасці з устаноўленым парадкам, вышэйуказаныя фонды выдзяляюцца гарвыканкомам для асоб, якія стаяць там на чарзе на набыццё аўтамабіляў. Прадпрыемствам, арганізацыям і вучэбным установам фонды на аўтамабілі выдзяляюцца толькі адпаведнымі міністэрствамі і ведамствамі.

Абласны аграпрамысловы камітэт не пярэчыць супраціў заключэння прамых дагавораў універсіта з калгасамі і саўгасамі для аказання дапамогі ў правядзенні ўборкі ўраджаю, пры ўмове папярэдняга ўзгаднення з аблаграпромам пераліку раёнаў, з гаспадаркамі якіх плануецца заключыць такія дагаворы.

Пытанні фінансавання расходаў на ўтрыманне універсітэта ў кампетэнцыю аблвыканкома не ўваходзяць.

**Н. КАЛАЦЭЙ,**
**першы намеснік старшыні аблвыканкома.**

## Гарадскі Савет народных дэпутатаў паведамляе

Выканком гарадскога Савета народных дэпутатаў паведамляе, што ў адпаведнасці з рашэннем сесіі гарсавета продаж асобных відаў мэблі, тавараў электрабытавога прызначэння ажыццяўляецца па талонах, выдадзеных у калектывах прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў горада. Для размеркавання ўказаных груп тавараў створана камісія ў саставе 13 чалавек.

Рэалізацыя дывановых вырабаў, ручнікоў махровых, накрывак «ско», галаўных убораў, парфумерыі, трыкатажных вырабаў, электратавараў (прасы, сокаваркі, кофеваркі, вафельніцы) ажыццяўляецца па талонах, выдадзеных на прадпрыемствах па ўзаемнай дагаворанасці ў магазінах або праз выязды гандаль у калектывах. У сувязі з гэтым дадзенае пытанне неабходна ўзгадніць з абкомам прафсаюза работнікаў народнай адукацыі і навукі.

Для праверкі санітарнага стану буфетаў і сталовых універсітэта, якасці прыгатавання страў, асартыменту страў будзе створана камісія , пасля заключэння якой будзе прынята адпаведнае рашэнне.

Студэнты, якія маюць пастаянную прапіску ў горадзе і жадаюць набыць аўтамабіль, павінны стаць на чаргу ў райвыканкомах. Аўтамабілі, выдзяляемыя упраўленнем гандлю аблвыканкома універсітэту, размяркоўваюцца па меркаванню працоўнага калектыву.

Інтэрнат у мікрараёне «Дзевятоўка» будзе ўключацца ў план будаўнічых арганізацый пасля прадстаўлення універсітэтам праектна-каштарыснай дакументацыі, тэрмін выдачы якой — май 1991 года.

У бягучым годзе на аб ´екце 64 кв. ж. д. па вул. Горкага з магазінам «100 дробязей» будтрэсту № 30 было прадугледжана асваенне задзельных 100 т. р. будаўніча-мантажных работ. У сувязі з паскарэннем рэалізацыі праграмы па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, дадатковым прыцягненнем кадраў і матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў на будаўніцтва пасёлкаў для перасяляемых, трэст не спраўляецца з планавымі паказчыкамі не толькі на задзельных аб ´ектах, але і не выкананы план увода 3 дамоў (182 кватэры), бальніцы хуткай дапамогі на 560 месц, іншых аб ´ектаў сацыяльнага заказу.

Па аналагічнай прычыне трэст не ўключае дадзены аб'ект у праграму і 1991 года.

**С. ДОМАШ,**
**старшыня выканкома гарадскога Савета народных дэпутатаў.**

*ІНФАРМАЦЫЯ ШТАБА ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ*

# ПАПРАЦАВАЛІ НЯДРЭННА

Прайшло ўжо больш двух месяцаў з пачатку вучэбных заняткаў, а ў многіх яшчэ ў памяці тыя дні, калі яны ў саставе студэнцкіх будаўнічых атрадаў працавалі на аб ´ектах народнай гаспадаркі. Для многіх студэнтаў гэтыя летнія месяцы з ´яўляюцца добрай падтрымкай, каб паправіць свой студэнцкі мізэрны бюджэт. Аднак нямала і такіх людзей, якія едуць у будаўнічыя атрады толькі для таго, каб заняць час і восенню не ехаць на сельскагаспадарчыя работы. Гэта праблема даўно ўжо ўжылася ў студэнцкім асяроддзі, і змагацца з ёю становіцца ўсё складаней.

Адметнай рысай прайшоўшага працоўнага семестра з ´яўляецца тое, што колькасць студэнтаў лінейнага атрада значна скарацілася. Калі ў мінулым годзе колькасць студэнтаў у лінейным атрадзе склала 15-18 чалавек, то ў гэтым годзе — 8-10 чалавек. Як правіла, у такіх атрадах асноўны націск рабіўся на вытворчыя паказчыкі і зусім упускалася грамадска-палітычная работа.

Пры падвядзенні вынікаў сацспаборніцтва лінейных студэнцкіх атрадаў ГрДзУ у трэцім працоўным семестры 1990 года, улічваліся наступныя паказчыкі: сярэднедзённая выпрацоўка на аднаго байца, сярэдняя заработная плата на аднаго байца, прыцягненне падлеткаў у састаў атрадаў, грамадска-палітычная работа, выкананне дагаворных умоў па колькасці атрада на дзень прыезда.

Сярод студэнцкіх будаўнічых атрадаў першае месца заняў атрад юрыдычнага факультэта **«Альтаір»** (камандзір А. Турлін, камісар І. Язэпчык). На другім месцы атрад **«Нёман»** з гістарычнага факультэта (камандзір А. Лагвіновіч, камісар М. Сямёнчык). Трэцяе месца вырашана не прысуджаць.

Сярод студэнцкіх атрадаў небудаўнічай накіраванасці першае месца заняў атрад **«Глорыя»** філалагічнага факультэта (камандзір Я. Саловіч, камісар А. Гойдзь). Другое месца ў атрада **«Біярытм»** біялагічнага факультэта (камандзір Я. Багдзевіч, камісар Т. Кароль). Трэцяе месца падзялілі паміж сабою атрады **«Блакітныя далі»** матэматычнага факультэта (камандзір С. Губін, камісар Г. Хвядук) і **«Элада»** філалагічнага факультэта (камандзір З. Шышко, камісар І. Малюкевіч).

Па выніках трэцяга працоўнага семестра сярод факультэтаў універсітэта першае месца заняў матэматычны, другое — юрыдычны і трэцяе — фізічны.

**Штаб працоўных спраў.**

НАМ ПІШУЦЬ

# Поспехаў Вам, Святлана Вітальеўна!

Наш расказ не столькі пра аспірантуру пры кафедры псіхалогіі, колькі пра яе заснавальніцу, нашага навуковага кіраўніка, прафесара Святлану Вітальеўну Кандрацьеву.

Раней кафедры псіхалогіі не было зусім. Існавала кафедра псіхалогіі і педагогікі. Не было ў нашым універсітэце да прыезду Кандрацьевай і ніводнага кандыдата псіхалагічных навук. Прыехаўшы да нас з украінскага горада Драгобыча, яна раздзяліла на дзве кафедру псіхалогіі і педагогікі і стала загадчыцай кафедры псіхалогіі.

Для таго, каб забяспечыць кафедру высокакваліфікаванымі спецыялістамі-псіхолагамі, па ініцыятыве Кандрацьевай была адкрыта аспірантура з двумя формамі навучання — завочнай і стацыянарнай. Спачатку яна фактычна без спецыялістаў, без базавай псіхалагічнай адукацыі набірала аспірантаў і рыхтавала будучых псіхолагаў. Першым аспірантам стаў Павел Раманавіч Галуза, які цяпер працуе дэканам факультэта пачатковага навучання.

Святлане Вітальеўне прыйшлося пачынаць працаваць на пустым месцы, рабіць усё самой, не шкадуючы часу і сіл. Нават і сёння няма яшчэ добрай матэрыяльна-тэхнічнай базы, лабараторыі, бібліятэкі, навукова-даследчага інстытута, з якім можна было б супрацоўнічаць, атрымліваць кансультацыі. Нягледзячы на гэта ўжо сёння можна гаварыць пра школу прафесара Кандрацьевай.

Нельга не сказаць пра дапамогу Святланы Вітальеўны нам, аспірантам, у напісанні дысертацый. Тэмы іх вельмі разнастайныя і актуальныя на сённяшні дзень. Гэты чалавек мае надзвычайную здольнасць даваць нам магчымасць самім шукаць, эксперыменціраваць, спасцігаць і, з другога боку, неяк апасрэдаваным спосабам дапамагаць, ды так, што іншы раз мы і самі не разумеем, што яна нам дапамагае, настолькі гэта не скоўвае нашу ініцыятыву. Дапамагаюць нам і былыя аспіранты, цяперашнія кандыдаты навук, якія працуюць на кафедры.

Мы, аспіранты, не адчуваем сябе ізаліравана, а з 'яўляемся паўнапраўнымі членамі калектыву кафедры, прымаем удзел не толькі ў грамадскай рабоце, але і ў вучэбным працэсе. Заўсёды бываем на пасяджэнні кафедры, наведваем адкрытыя лекцыі выкладчыкаў кафедры.

Хацелася б адзначыць, што Кандрацьева рыхтуе кадры не толькі для нашага універсітэта, але і для іншых вышэйшых навучальных устаноў краіны. Так, Таццяна Шырокава цяпер працуе ў Мінску, Ігар Кірылавіч Мінаеў — у Драгобычы. Абараняюць свае навуковыя працы навучэнцы Кандрацьевай не ў Мінску, а ў Маскве.

У планах Святланы Вятальеўны стварэнне лабараторыі псіхалогіі, таварыства псіхолагаў, пашырэнне колькасці кадраў. Над гэтым яна цяпер і працуе, але наперадзе яшчэ шмат работы.

Ва ўмовах невялікага абласнога горада, як наш Гродна, дзе практычна адсутнічае навуковая псіхалагічная база, Кандрацьевай фактычна была створана школа па падрыхтоўцы спецыялістаў-псіхолагаў. А энергіі ў Святланы Вітальеўны хопіць на ўсіх нас, маладых, ды і працалюбівасці нам трэба яшчэ шмат у яе вучыцца.

**П. КАВАЛЕЎСКІ,**
**Л. СЯМЧУК,**
**аспіранты кафедры псіхалогіі.**

НЕКАЛЬКІ ПАРАД НА КАРЫСЦЬ СТУДЭНТАМ

# Дзе ўзяць грошы?

ці Што рабіць?
ці Уніжаныя і зняважаныя
ці Бедныя людзі

Карацей, некалькі парад на карысць студэнтам.

Умова: студэнт — такі ж грамадзянін, як і астатнія. Яму патрэбны грошы на харчаванне, прыгожае адзенне, цікавы адпачынак.

Пытанне вынесена ў загаловак.

Рашэнне мае некалькі варыянтаў.

**ВАРЫЯНТ ПЕРШЫ.** Калі вы збіраецеся наведаць родных і блізкіх, асабліва бабуль і цётак, не забудзьцеся прыхапіць недарагі, але арыгінальны падарунак. Не забудзьцеся пры сустрэчы пацалаваць дарагога сваяка ў шчаку і некалькі разоў перапытаць пра здароўе. Размаўляйце спакойна, слухайце ўважліва, глядзіце любасным поглядам. Да канца сустрэчы сума вам ужо гарантавана. Паспрабуйце за адну паездку наведаць некалькі сваякоў.

**ВАРЫЯНТ ДРУГІ.** Стыпендыя і матэрыяльная дапамога. Вучыцца трэба старанна: добрая вучоба, удалая здача сесіі забяспечаць стыпендыю.

Матэрыяльная дапамога — справа тонкая. Усталюйце добрыя адносіны са старшынёй прафкома. Пазычце ў яго пэўную суму. Не вяртайце яе ў тэрмін. Пакрысе падвядзіце вашага сябра да думкі пра матэрыяльную дапамогу. Збіраючы подпісы групоргаў і іншых, не ўздумайце апрануць варанку ці фінскія боты. Дзяўчатам рэкамендую часова перайсці з французскай парфумы на духі «Чырвоная Масква» (калі іх зараз можна дзе-небудзь купіць).

**ВАРЫЯНТ ТРЭЦІ.** Трэба праявіць сваю ініцыятыву. Гэты варыянт больш важны, ён залежыць ад вашага жадання працаваць. Паспрабуйце зайсці ў прафком студэнтаў ці камітэт камсамола. Магу запэўніць вас, што адтуль вы не выйдзеце з пустымі рукамі. Ва ўсякім разе, вам прапануюць шмат цікавай работы, але ж вы можаце і адмовіцца, таму трэба мець ахвоту дабываць грошы сваімі рукамі. Зараз ужо функцыяніруе Служба занятасці студэнтаў, якая дапаможа зацікаўленаму студэнту знайсці работу па яго густу. Студэнт зможа працаваць у вольны ад заняткаў час. Заканчваецца работа па арганізацыі Фонда сацыяльнай дапамогі. Студэнты, якія мала забяспечаны, змогуць атрымаць матэрыяльную дапамогу ў выглядзе грошай, што пералічваюць на рахунак Фонда арганізацыі, прадпрыемствы і інш.

За даведкамі звяртайцеся ў 301 ауд. (камітэт камсамола). Там вам яшчэ прапануюць папрацаваць у аператыўным атрадзе, дзе праца цікавая і нядрэнна аплачваецца. Таксама ва універсітэце зараз працуюць курсы манікеншчыц, машынапісу і інш. Шмат цікавых прафесій вам прапануюць на факультэце грамадскіх прафесій (ФГП). Там вы атрымаеце дадатковую спецыяльнасць і зможаце выкарыстаць яе ў сваіх жа інтарэсах. Думаю, што ў вашым кашальку сума грошай павялічыцца.

**ВАРЫЯНТ ЧАЦВЁРТЫ.** У сувязі з пераходам да рынкавых адносін зменіцца і становішча студэнтаў. З першага студзеня 1991 года стыпендыя студэнтаў павялічыцца да 60 рублёў, але ўжо зараз распрацоўваюцца дакументы, у якіх будзе зацверджана больш высокая стыпендыя, т. я. павышаюцца цэны на розныя тавары народнага спажывання. Студэнты, як мала забяспечаны слой грамадства, будуць атрымліваць грашовую кампенсацыю і тады студэнцкая стыпендыя ўзрасце ў некалькі разоў. Шырока будуць выкарыстоўвацца надбаўкі да стыпендыі. З 'явіцца магчымасць зарабіць. Атрымаюць надбаўкі да стыпендыі тыя, у каго мала забяспечаны сем 'і і хто мае пастаянныя грамадскія нагрузкі: старшыні і члены студэнцкіх саветаў, тыя, хто выконвае рамонтна-гаспадарчыя работы ва універсітэце і інш. Так, іх праца будзе аплачвацца. Як бачыце, тут усё залежыць ад вас, трэба праявіць ініцыятыву, паказаць на што вы здольныя, не сядзець, склаўшы рукі, як кажуць «без труда — не вытащишь рыбку из пруда». Разумею, што будатрады, дзе амаль адны дзяўчаты, не даюць значнага прыбытку ў ваш кішэнь, дык давайце не будзем чакаць лета, пачынайце дзейнічаць ужо сёння, а вам у гэтым дапамогуць.

**Г. КАМЕНЕВА.**

# ЮРЫДЫЧНАЯ ДАВЕДКА

Юрысконсульт **А. Белавусаў** працягвае адказваць на пытанні студэнтаў.

**— Ці дапускаецца скарачэнне колькасці вывучаемых дысцыплін і экзаменаў?**

— Па рашэнню Вучонага савета ВНУ цяпер дазваляецца скарачэнне колькасці вывучаемых вучэбных дысцыплін за кошт іх аб 'яднання, устанаўленне аднаго экзамена па курсу, што чытаецца некалькі семестраў. Па рашэнню кафедр грамадскіх навук дапускаецца завяршэнне вывучэння вучэбнай дысцыпліны адным выніковым экзаменам з выключэннем прамежкавых семестравых экзаменаў.

**— Ці можа праводзіцца здача экзаменаў і залікаў па факультатыўных вучэбных дысцыплінах?**

— Студэнты могуць здаваць экзамены і залікі па факультатыўных дысцыплінах. Вынікі іх па жаданню студэнтаў могуць уносіцца ў ведамасць, заліковую кніжку, а таксама ў выпіску з заліковай ведамасці (дадатак да дыплома).

**— Які парадак пераздачы экзамена пры атрыманні нездавальняючай адзнакі?**

— Пераздача аднаго і таго ж экзамена дапускаецца не больш двух разоў пасля заканчэння сесіі з дазволу дэкана факультэта экзаменатару, які прымаў экзамен. У перыяд экзаменацыйнай сесіі пераздача экзамена дазваляецца толькі ў асобных выпадках пры наяўнасці ўважлівых прычын.

**— Ці дазваляецца пераздача экзамена з мэтай павышэння станоўчай адзнакі?**

— У выключных выпадках рэктар ВНУ мае права дазволіць студэнту паўторную здачу курсавога экзамена з мэтай павышэння станоўчай адзнакі. Рэктар выносіць сваё рашэнне па прадстаўленню дэкана факультэта з улікам думкі грамадскіх арганізацый.

**— Ці могуць студэнты, што вучацца ў ВНУ з адрывам ад вытворчасці, вызваляцца ад праходжання вытворчай практыкі пры наяўнасці ўважлівых прычын?**

— Праходжанне вытворчай практыкі студэнтамі, што навучаюцца па дзённай форме, прадугледжана вучэбным планам. Таму вызваленне ад вытворчай практыкі не дапускаецца. Студэнты, якія не змаглі прайсці практыку ва ўстаноўленыя тэрміны па хваробе, у сувязі з неабходнасцю догляду за дзецьмі і іншымі ўважлівымі прычынамі, абавязаны прайсці яе ў іншы час, які ўстанаўліваецца дэканам факультэта.

НАМ ПІШУЦЬ

# СІСТЭМА НАРОДНАЙ АДУКАЦЫІ

**Змены, якія адбываюцца ў жыцці савецкага грамадства і яго дзяржаўных структур, непасрэдна ўзаемадзейнічаюць з сістэмай вышэйшай і сярэдняй адукацыі. Гэтая сістэма і яе інстытуты, напрыклад, універсітэт, не могуць не змяняцца. Пытанне: у які бок! І наколькі гэтыя змены адаб 'юцца ў будучым на ўзроўні адукаванасці і выхаванасці індывідыума і, як вынік, на ўзроўні развіцця дзяржавы праз дзесятак-другі гадоў. Ці будуць нашы дзеці і ўнукі імкнуцца атрымаць вышэйшую і сярэднюю адукацыю ў Зл. Штатах Амерыкі, Заходняй Еўропе, падобна моладзі з краін Лацінскай Амерыкі, Афрыкі, Азіі (капіталістычных, але не «развітых краін»), альбо да нас будуць ехаць, каб адчуць перавагі дэмакратычнага сацыялізму і атрымаць ці палепшыць веды ў нашых універсітэтах! Бліжэйшыя некалькі гадоў (гады выбару і пераўтварэнняў) павінны выканаць «капітальны рамонт» універсітэцкай сістэмы ў Савецкай дзяржаве і першы канкрэтны крок зроблены — указ Прэзідэнта аб самастойнасці універсітэтаў. Таму я прапаную сваё суб 'ектыўнае апісанне на базе аб 'ектыўных даных сістэмы універсітэцкай адукацыі Японіі. Магчыма, яно будзе карысным для роздуму, супастаўлення і канчатковага вырабу структур і механізмаў функцыяніравання нашых беларускіх універсітэтаў у бліжэйшым будучым.**

### АГУЛЬНАЯ АДУКАЦЫЙНАЯ СІСТЭМА

У сваёй аснове яна пабудавана наступным чынам. 6 гадоў пачатковай (простай) школы і 3 гады ніжняй сярэдняй школы — абавязковая дзяржаўная адукацыя. Гэта можна суаднесці прыкладна да нашай «васьмігодкі», толькі год прыплюсаваць. Амаль усе праблемы падлеткавага перыяду і звязаныя з імі парушэнні дысцыпліны і нежаданне часткі школьнікаў вучыцца ўвогуле падобныя да нашых, калі не сказаць — аднолькавыя. Ёсць выпадкі (у апошнія гады) «фізічнага супраціўлення» патрабавальным маладым настаўнікам з боку вучняў, а на апошніх уздзейнічаюць праз бацькоў (паведамленні, характарыстыка) і адхіленнем непаслухмяных вучняў ад заняткаў увогуле на пэўны час. Усе парушэнні і меры пакарання заносяцца ў атэстат, які выдаецца пасля экзаменаў на кожны з этапаў. Старэйшае пакаленне схільна лічыць рост правапарушэнняў у школе прамым вынікам «амерыканізацыі» традыцыйнай японскай культуры.

Педагагічныя калектывы пераважна мужчынскія. Да пачатковай школы большая частка дзяцей атрымлівае пэўную падрыхтоўку ў дзіцячых садах (дарэчы, групы дзяцей у дзіцячых садах і класы ў школах налічваюць 20—25 чалавек і болей). Пачынаецца абавязковая адукацыя з 6 гадоў.

Далей пачынаецца сістэма даволі рознай па часу і па характару прафесіянальнай і спецыяльнай адукацыі. Яна выключна добраахвотная, але часткова рэгулюемая дзяржаўнымі адукацыйнымі стандартамі і праграмамі.

Адразу пасля ніжняй сярэдняй школы пятнаццацігадовыя юнакі і дзяўчаты могуць вучыцца: у верхняй сярэдняй школе (3 гады з поўным днём навучання ці 4 з няпоўным), у тэхналагічным каледжы (3 ці 5 гадоў), у розных другіх школах ад 1 да 3 гадоў (напрыклад, школа прафесіянальнай падрыхтоўкі служачых). Каб атрымаць вышэйшую адукацыю, трэба, як правіла, «прайсці» верхнюю сярэднюю школу, тэхналагічны каледж альбо тры гады ў прафесіянальнай школе. Гэта значыць, ва універсітэт ці каледж пачынаюць паступаць у 18—20 гадоў (у большасці дзяржаўных універсітэтаў існуе конкурсны набор), і павінны мець 12 гадоў школы «за плячыма». Універсітэцкі перыяд навучання працягваецца 4 гады для курсаў ніжняга рангу і яшчэ 5 гадоў курсы верхняга рангу (усяго 9 гадоў з гакам). «Гак» для тых, хто не паспявае выканаць праграму своечасова, хаця ўсе вельмі стараюцца, таму што адукацыя ўсюды платная, толькі ў дзяржаўных установах дзешавей. Падрабязней пра сістэму аплаты наперадзе, на прыкладзе універсітэта Кіота.

Такім чынам, поўны курс адукацыі ў Японіі заканчваецца ва ўзросце мінімум 27 гадоў з магчымым (але не абавязковым) атрыманнем ступені доктара навук.

### УНІВЕРСІТЭТЫ

Японскія універсітэты дзеляцца на 3 катэгорыі ў залежнасці ад іх адміністрацыі: дзяржаўныя, грамадскія і прыватныя. Яны грунтуюцца на пэўным устаноўленым стандарце, які ў той жа час мае розныя ўзроўні. Агульная колькасць універсітэтаў і каледжаў 490, з якіх 95 дзяржаўных, 38 грамадскіх і 351 прыватны (даныя на 1989 год). Прыкладна палова універсітэтаў мае курсы «верхняга рангу», некаторыя маюць навуковыя інстытуты ці іншыя доследныя ўстановы. Агульная колькасць членаў універсітэтаў на 1 мая 1988 года была 1.994.615 чалавек.

Дзяржаўныя універсітэты размешчаны па ўсёй краіне, ад аднаго і болей у кожнай прэфектуры (вобласці). У прэфектуры Кіота, напрыклад, 22 універсітэты, у якіх 10.5 тысяч выкладчыкаў і 110 тысяч студэнтаў. Для параўнання — прэфектура Кіота займае плошчу 610 квадратных кіламетраў і налічвае прыкладна 2.5 мільёны жыхароў.

Месцазнаходжанне універсітэтаў традыцыйна звязана з індустрыяй альбо культурнымі цэнтрамі. Універсітэты маюць факультэты і аддзяленні з рознымі спецыяльнасцямі для навучання.

Кожны універсітэт мае свае падручнікі для працэсу навучання на факультэтах, аддзяленнях, курсах верхняга рангу, навуковых інстытутах. Большасць іх напісана па-японску, але частка універсітэтаў (Кіота універсітэт, напрыклад) мае ўласныя англамоўныя выданні.

### КУРСЫ НІЖНЯГА РАНГУ.

Па-нашаму іх можна было б назваць «пачатковым універсітэтам». Акадэмічны год пачынаецца, як і ў школе, з 1 красавіка і заканчваецца 31 сакавіка наступнага года. Колькасць навучальных дзён, як правіла, 210 (35 тыдняў), улічваючы тэрмін экзаменацыйны. Летнія канікулы з сярэдзіны ліпеня да канца жніўня, могуць вагацца ў залежнасці ад таго, як гэта заведзена ў даным універсітэце. Зімовыя канікулы: канец снежня — пачатак лютага, вясновыя — канец лютага — пачатак красавіка.

# ПАМЯЦІ ТАВАРЫША



## З НЕКРАЛОГУ

**Пасля цяжкай хваробы памёр ветэран партыі і Вялікай Айчыннай вайны, персанальны пенсіянер рэспубліканскага значэння ДЗМІТРЫЙ СПІРЫДОНАВІЧ МАРКОЎСКІ.**

**Дз. С. Маркоўскі нарадзіўся ў 1912 годзе ў в. Мачэск Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці. Пачынаючы з 1930 года ён працаваў у сістэме народнай адукацыі рэспублікі. Быў дырэктарам сямігадовай школы, начальнікам упраўлення Міністэрства асветы, дырэктарам педвучылішча, а з 1955 па 1973 гады — рэктарам Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Я. Купалы. Шмат тысяч яго выхавальнікаў на ўсё жыццё захавалі яго высокае педагагічнае майстэрства, цудоўныя якасці арганізатара і кіраўніка працоўных калектываў.**

**Дз. С. Маркоўскі валодаў рысамі камуніста і вучонага, яго навуковая работа і педагагічная дзейнасць заўсёды былі прасякнуты духам патрыятызму. Ён быў вельмі сумленным, добразычлівым і ўважлівым.**

**Сем гадоў, з 1938 па 1945, Дз. С. Маркоўскі знаходзіўся ў радах Савецкай Арміі. Ён прайшоў праз дзве вайны, з гонарам выканаў абавязак салдата і палітработніка.**

**Дз. С. Маркоўскі прымаў актыўны удзел у грамадска-палітычным жыцці нашай вобласці. Ён неаднаразова выбіраўся ў кіраўнічыя органы абласной партарганізацыі і абласнога Савета народных дэпутатаў, працяглы час быў кіраўніком абласной арганізацыі таварыства «Веды».**

**Працоўныя і ратныя подзвігі Дз. С. Маркоўскага адзначаны шматлікімі ўрадавымі ўзнагародамі.**

**Светлая памяць пра цудоўнага вучонага, педагога і таварыша захаваецца ў нашых сэрцах назаўсёды.**

## *Сціплы, сумленны*

Побач з Дзмітрыем Спірыдонавічам Маркоўскім я працаваў больш дзесяці гадоў. Быў абраны тады старшынёй прафсаюзнага камітэта выкладчыкаў і не выпадкова многія пытанні вырашалі разам. Як адзначалі калегі, ды і мая асабістая думка такая, што адрознівалі нашага рэктара перш за ўсё такія якасці як добразычлівасць, увага да людзей, сумленне. Разам з тым гэта быў высокакваліфікаваны педагог, добры арганізатар, паважаны кіраўнік, актывіст грамадскага жыцця. Памятаю, мы былі дэпутатамі гарадскога Савета народных дэпутатаў аднаго склікання. І не раз даводзілася Дзмітрыю Спірыдонавічу змагацца за справядлівасць, адстойваць свой пункт гледжання.

Сярод калег па рабоце Дзмітрый Спірыдонавіч карыстаўся нязменным аўтарытэтам, паважалі яго і студэнты.

За плячыма Дзмітрыя Спірыдонавіча — дзве вайны. Ён свята выконваў свой абавязак салдата і палітработніка ў грозныя гады ліхалецця, удзельнічаў у вызваленні Украіны, Крыма, Малдавіі, Аўстрыі, Венгрыі.

Шмат сіл, намаганняў спатрэбілася і тады, калі прыйшоў час будаваць новае жыццё ў першыя пасляваенныя гады.

Для педагагічнага інстытута ў Гродне, яго калектыву, які ўзначаліў Дзмітрый Спірыдонавіч, гэта быў надзвычай нялёгкі час. Амаль на голым месцы, нанава, трэба было ствараць матэрыяльна-тэхнічную базу, фарміраваць педагагічны калектыў, арганізаваць падрыхтоўку педагагічных кадраў для патрэб рэгіёна. Па расказах тых, хто працаваў у педінстытуце ў тыя гады, Дзмітрый Спірыдонавіч не шкадаваў часу, здароўя, ведаў, здольнасцей, каб справы ішлі як мага лепш і хутчэй. Дапамагала і загартоўка салдата, воіна.

Дарэчы, Дзмітрый Спірыдонавіч актыўна ўдзельнічаў і ў ваенна-патрыятычным выхаванні студэнтаў, моладзі ўвогуле. Па меры магчымасці выступаў перад моладдзю, расказваў аб мужнасці і гераізме савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны, вучыў на прыкладах, пераконваў у неабходнасці жыць на карысць Радзіме.

Знаходзячыся на заслужаным адпачынку, калі дазваляла здароўе, па-ранейшаму цікавіўся справамі калектыву, студэнтаў, наведваў партыйныя сходы.

На жаль, нядаўна мы назаўсёды развіталіся з калегай, таварышам, сумленным чалавекам. Ды толькі ўспаміны аб ім саграваюць сэрца, напаўняюць цяплом душу.

**П. ВАСІЛЬЕЎ,**
**старшыня Савета ветэранаў вайны і працы.**

## *Самыя цёплыя пачуцці*

Я сустрэлася з Дзмітрыем Спірыдонавічам Маркоўскім у педагагічным інстытуце імя Я. Купалы, калі працавала выкладчыкам матэматыкі. Потым давялося супрацоўнічаць з ім ужо ў якасці прарэктара па вучэбнай рабоце.

Калі сёння думаю пра калегу, успамінаю яго, узнікаюць самыя цёплыя пачуцці. І не выпадкова. Гэта чалавек вялікай дабрыні. багатага сэрца. Да калег ён адносіўся з нязменнай павагай, калі гэта было ў яго сілах — дапамагаў словам, справай, добрай своечасовай парадай. Не магу не сказаць і таго, што знаходзіліся ў калектыве асобныя людзі, якія, бывала, у сваіх асабістых мэтах карысталіся яго даверам, дабрынёй.

Дзмітрый Спірыдонавіч паважаў людзей, быў перакананы ў тым, што кожны з іх мае права на добрыя да сябе адносіны, разуменне. Асабліва, мне здаецца, адчувалі гэта тыя выкладчыкі, якія толькі пачалі працаваць са студэнтамі. Што ж датычыцца студэнтаў, то ў асобе свайго рэктара, Дзмітрыя Спірыдонавіча Маркоўскага, яны бачылі чалавека клапатлівага, зацікаўленага ў тым, каб ім лепш жылося, каб вучыцца было цікава, каб былі добрыя ўмовы для змястоўнага адпачынку.

Шмат намаганняў, часу, клопатаў спатрэбілася рэктару для таго, каб ажыццявіць многія гаспадарчыя планы, у прыватнасці, будаўніцтва інтэрнатаў для студэнтаў, расшырэнне універсітэцкіх плошчаў, удасканальванне матэрыяльна-тэхнічнай базы навучальнай установы.

Чалавек пакідае след у жыцці, калі ён жыве сярод людзей, дзеля людзей, аддаючы ім часцінкі сэрца, душы. Гэтае я магу сказаць пра свайго калегу Дзмітрыя Спірыдонавіча. Шкада толькі, што не заўжды, апынуўшыся ў скаладаных жыццёвых сітуацыях, ён знаходзіў у сабе сілы супрацьстаяць нягодам, перамагаць іх.

Год за годам праходзіць наша жыццё. Сёння ўжо многія вучні Дзмітрыя Спірыдонавіча — вядомыя педагогі, выкладчыкі, удзячныя настаўніку, добраму і чалавечнаму. Ён — у памяці многіх. Няхай светлай будзе гэта памяць.

**Л. КІРЫЛЮК,**
**дэкан матэматычнага факультэта.**

# *Ў ЯПОНІІ*

Большасць універсітэтаў працуе па двухсеместравай сістэме, некаторыя прадметы вывучаюцца на працягу года. Дысцыпліны ў цэлым класіфіцыруюцца на агульнаадукацыйныя, замежных моў, здароўя і фізічнай культуры, прафесіянальныя. Дысцыпліны залежаць ад выбранага курсу ці факультэта навучання. Набор на факультэт ці курс вызначаецца універсітэтам.

Універсітэты дапускаюць свабоднае навучанне, ці, лепей, навучанне «у крэдыт». Толькі на курсах медыцынскіх навук і дантыстаў абавязковае наведванне. У канцы кожнага курсу пэўнай дысцыпліны кожны студэнт здае пісьмовы залік-экзамен як «плату за крэдыт даверу». Усяго за 4 гады студэнт мае звычайна 124 тэсты (залікі-экзамены). Для медыцынскіх і ветэрынарных навук час навучання 6 гадоў. Калі ўсе тэсты студэнту будуць залічаны, ён атрымлівае ступень «Гакусі» (бакалаўр у еўрапейскай сістэме). Ступені розняцца ў залежнасці ад прафесіі, напрыклад, «інжынер» або «прававед». Выпускніку выдаецца дыплом і пасведчанне «Гакусі».

### КУРСЫ ВЫШЭЙШАГА РАНГУ

Гэта два гады курс **«майстра»** і 3 гады курс **«доктара».** Каб здаць уступныя экзамены для «майстра», абітурыент павінен мець ступень «Гакусі» або выявіць веды роўныя ці большыя універсітэцкім, калі вучыўся ў каледжы ці прафесіянальнай школе. На доктарскі курс можна пайсці толькі пасля завяршэння курсу майстра. Для медыкаў і дантыстаў ёсць толькі доктарскі курс чатырохгадовы (за выключэннем некалькіх універсітэтаў). Сістэма навучання такая ж, як і ў «пачатковым» універсітэце. Той, хто закончыў курсы майстра, атрымлівае ступень «Сюсі», для гэтага трэба здаць 30 залікаў-экзаменаў па спецыяльных прадметах і «абараніць» свае тэзісы для ступені «Сюсі» і «прайсці» выпускныя экзамены. Некаторыя студэнты не адольваюць праграму за 2 гады і вучацца 3-4.

Доктарскія курсы працягваюцца 3 і болей гадоў. І завяршаюцца прысуджэннем ступені «Хакусі», калі студэнт здасць пэўную колькасць залікаў (значная варыяцыя па колькасці на розных спецыяльнасцях), абароніць тэзісы «Хакусі» і зможа здаць усе выпускныя экзамены.

Акрамя гэтых «вязняў японскай адукацыі» (чаму я іх так характарызую, чытач, думаю, зразумее ў далейшым, калі апішу канкрэтныя ўмовы працы, вучобы і экзаменаў на «родным» інжынерным факультэце Кіота універсітэта) існуюць і «Кэнкюсэі» (да іх адносяць і мяне) — пры вольнай трактоўцы проста «абы-які студэнт», або па-англійску больш паважліва — студэнт даследчык.

Кэнкюсай Ручыко-сан (Лучко) атрымаў з рук Танака-сэнсэя (прафесар, загадчык лабараторыі) на другі ці трэці дзень пасля з'яўлення ў лабараторыі навуковую тэму для даследаванняў, магчымасць працаваць разам з «сюсі» і «хакусі» у часе і прасторы лабараторыі і за яе межамі, дакладваць вынікі прыкладна 1 раз у месяц, дзяжурыць і г.д. Але мне не трэба здаваць экзаменаў. Між тым, калі б я захацеў (але ніколі больш не захачу), то мог бы паспрабаваць здаць уступныя экзамены на курс доктара (кандыдацкае званне залічылі б як «сюсі» і потым (калі б залічылі) вучыцца 3 і болей гадоў.

### НАВУКОВЫЯ ІНСТЫТУТЫ УНІВЕРСІТЭТАЎ

У Японіі існуе каля 440 навуковых інстытутаў і іншых даследчых установаў пры універсітэтах дзеля правядзення даследаванняў на вышэйшым узроўні па розных спецыяльнасцях.

Прафесура і супрацоўнікі гэтых інстытутаў займаюцца ў асноўным навукай і менш вучэбным працэсам.

### ТЭХНАЛАГІЧНЫЯ КАЛЕДЖЫ

Гэтая сістэма блізкая да універсітэтаў, але заснавана нядаўна, у 1962 годзе, і накіравана на тое, каб мець высокаадукаваныя кадры для прамысловасці. Усяго ёсць 54 дзяржаўных, 4 грамадскіх, 4 прыватных тэхналагічных каледжаў (5 дзяржаўных рыхтуюць кадры для гандлёвага флоту). Колькасць студэнтаў на май 1988 года была 50934 чалавекі. Каледжы размешчаны па ўсёй Японіі, у асноўным набіраюць студэнтаў са свайго рэгіёну і моцна звязаны з апошнім.

Каледж мае звычайна 3-4 аддзяленні. Кожнае аддзяленне мае 1-2 класы і кожны клас налічвае каля 40 студэнтаў.

Праграма навучання разлічана на 5 гадоў: першая палова — агульная вышэйшая адукацыя (3 гады), а потым большасць прадметаў тэхнічнага плану з шырокай і грунтоўнай практыкай і эксперыментамі. Школьны каляндар падобны на універсітэцкі, толькі веснавыя канікулы карацейшыя прыкладна на 20 дзён.

Сістэма навучання таксама «крэдытная», але адрозніваецца ад універсітэцкай тым, што здача залікаў «разнесена» на кожны год і калі студэнт не выканаў праграму акадэмічнага году (не здаў хоць адзін экзамен), ён павінен паўтарыць увесь навучальны год зноў.

Закончыўшы каледж, выпускнік можа быць прыняты студэнтам ва універсітэт на другі ці трэці гады навучання.

### ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫЯ ШКОЛЫ

Гэтая сістэма арганізавана ў 1976 годзе і адрозніваецца ад звычайнай адукацыйнай тым, што мае свабодны набор тых, хто хоча ўключыцца ў работу на прадпрыемстве і ва установах.

Раней былі разнастайныя школы, а цяпер дзейнічае пэўны стандарт: не менш чым 40 рэгулярных груп студэнтаў, не менш чым гадавы курс прадмета навучання і не менш чым 800 вучэбных гадзін у год.

Прафесіянальная школа грунтуецца на 3 наступных курсах, якія адрозніваюцца па ўзроўню навучання — вышэйшыя сярэднія курсы для тых, хто закончыў ніжэйшую сярэднюю школу, курсы павышанага ўзроўню для тых, хто мае дыплом верхняй сярэдняй школы і агульныя курсы прызнання кваліфікацыі.

Прафесіянальныя школы, якія маюць курсы павышанага ўзроўню, называюцца «Сэммонгакко» (іх у Японіі 2622 з 3191 прафесіянальных школ). Каля 90 працэнтаў прафесіянальных школ прыватныя. Колькасць студэнтаў у іх на май 1988 года была 699.556 чалавек, з іх 521574) — на курсах павышанага ўзроўню. Большая колькасць студэнтаў вучыцца ў медыцынскім напрамку (малодшы персанал), далей — індустрыя (грамадзянскія інжынеры і архітэктары, інжынеры-электрыкі і электроншчыкі, камп'ютэрныя наладчыкі) і «хатняя эканоміка» (напрыклад, спецыялісты па вырабу японскага і «заходняга» адзення). Курсы павышанага ўзроўню працягваюцца 2 гады і даюць студэнту вышэйшы ўзровень кваліфікацыі, неабходны для канкрэтнай справы. Дыплом такіх курсаў прыпадабняецца да дыплома каледжа.

**В. ЛУЧКО,**
**кандыдат біялагічных навук.**

## ДАЛЕКАЕ-БЛІЗКАЕ

**Кітаб (арабск. — кніга) — распаўсюджаны сярод беларускіх татар рукапісны зборнік розных, у асноўным рэлігійных тэкстаў, запісаных на беларускай мове арабскімі літарамі. Першыя кітабы з´явіліся ў XVI стагоддзі, калі перасяленцы татары з Залатой Арды на беларускія землі пры вялікім князе літоўскім Вітаўце пачалі забываць сваю родную мову і сталі карыстацца беларускай. Дзякуючы таму, што ў заснаваным на арабскай графіцы алфавіце беларускіх татар налічвалася 46 літар, гукавае адлюстраванне тагачаснай беларускай мовы ў кітабах захавалася лепш, чым у тэкстах, запісаных кірыліцай. Кітабы ўяўляюць вялікую вартасць для філолагаў-беларусаведаў. Акрамя таго, яны прадстаўляюць каштоўнасць як літаратурныя творы, а летапісы — яшчэ і гістарычную каштоўнасць для сучаснікаў.**

**Сённая на старонках нашай газеты вы можаце пазнаёміцца з цікавым як у літаратурным, так і ў гістарычным сэнсе творам старажытнай пісьменнасці. Гэта казка, якую мы пераклалі і з некатораымі скарачэннямі і літаратурнай апрацоўкай прапаноўваем вашай увазе.**

# СТАРАЖЫТНАЯ КАЗКА З КІТАБУ

Гэта гісторыя і аповесць. Спеўшы кароткую малітву Селеват, трэба паслухаць яе. Жыў адзін маладзец, які ў размове і ў навуцы вельмі быў дасканалы, але надта абяднеў, бацьку ды матку не меў чым пакарміць. Маладзец што робіць: пайшоў да бацькі з маткаю і кажа: «Ой, бацька і матка! Верце мне, я так абяднеў, што не маю чым вас карміць і ў што апранаць. З вашага дазвалення я пакіну вас аднаму гаспадару. А калі мне пан Бог дапаможа, то я вас выкуплю». Бацька і маці яму дазволілі.

Тады ён пайшоў да аднаго гаспадара і казаў так:

— Пан гаспадар! Маю аднаго нявольніка і нявольніцу. Абодва старыя. Купі іх у мяне. Вельмі абяднеў, не маю чым іх карміць. А калі з голада паўміраюць, то на маю душу той грэх падзе. Калі ж мне пан Бог дапаможа, я іх выкуплю ў твёй міласці.

— Пан маладзец,— гаспадар гаворыць.— Сам на сябе нагаворваеш, што халоп і халопіна старыя. Хто іх у цябе купіць?

— Для Бога купі. Не маю ні аднаго граша, каб карміць іх. Няхай табе век свой служаць, пакуль мне пан Бог дапаможа.

— Маладзец, наколькі яны дарагія? Што магу даць табе, што прасіць будзеш,— паведай мне.

— За старога халопа дай старога каня, а за старую халопіну — стары кажух.

Той гаспадар даў яму старога каня і стары кажух, і быў таму вельмі ўдзячны, што так танна купіў. А маладзец таксама быў задаволены, што дастаў каня і кажух, бо меў з чым шчасце шукаць. Бацьку ж і матку пакінуў служыць. Гаспадар ім ежу, піццё даваў даволі. Маладзец іх пану Богу даручыў і з тым у дарогу рушыў. Пабачыце, пан Бог пазычыць яму ў дарозе.

Едучы, сустракае аднаго падарожніка, які стаміўся, ды і сам чалавек занепакоены такі. З вялікай дарогі. Блізка да яго пад´ехаў маладзец, прывітаўся. Той адказаў.

— Такую пільну дарогу маешь, што так хутка едзеш, аж конь пад табою стаміўся,— маладзец кажа.

— Я маю лісты да таго і таго замка. Пільна наказана падаць.

— Дай мне тыя лісты і назад вяртайся, як раз я да таго замка еду і лісты падам.

Падарожнік лісты аддаўшы, сам назад павярнуўся. А маладзец падумаў сабе, што лісты вязе і не ведае, што ў іх напісана. Хаця б пабачыць, што там. І прачытаў: «Хто б тыя лісты да таго замку падаў, таму галаву адрубіць і пад замкам на кол пасадзіць». Маладец кажа сам сабе: «Бачыш, што за справа? Мала што сабе галаву не загубіў, каб лісты не прачытаў, не даведаўся б, што ў іх піша. Без вестак загінуў бы». Даў ён хвалу Богу і кажа сам сабе: «Справа чакае мяне». І паехаў далей.

Прыехаў да аднаго горада. А горад за вялікаю сцяною, люду поўна. Бачыць каля горада калы паўбіваныя. На кожным — чалавечая галава забітая. Падумаў і дзівіўся таму нямала. І кажа сам сабе: «Што гэта за дзіва? Хаця б адну ноч перананачую і даведаюся:.

Маладзец у той горад заехаў, накіраваўся да адной хаты малой. А ў той хаце бабка старая была. Маладзец кажа:

— Матка! Дазволь мне ў тваёй хаце пераначаваць.

У той бабкі адзін сын быў, днямі памёр. І падобны ён быў да таго малайца. Бабка ж у вялікім смутку па свайму сыну. Убачыўшы малайца, яна ўзрадавалася і кажа:

— Заязджай, сынку, у малую хату і начуй.

Заехаў маладзец у бабкіну хату і заначаваў. Была ноч бяспечна, маладзец з бабкаю размаўляў, бабку маткаю называў, а яна яго — сынам.

— Матка! Што гэта на калах чалавечыя галовы? Для чаго забітыя?

— У тым горадзе гаспадар адзін мае дачку. Паслухай, паведаю табе... Да той яго панны вельмі шмат каралевічаў, князёў прыязджала. На дыспут выклікала з мудрасцю сваёй. Ніхто не адказаў, чаго яна запытала. Той панне-каралеўне роўні няма на свеце. Якая мудрая! Якая прыгожая! Шмат розных каралевічаў, князёў і гаспадарскіх сыноў прыходзілі і канкурыравалі, пакваліліся на яе і прыносілі скарбы. Тая гаспадарчына скарбы не заўважала. Прымаючы і экзаменуючы аднаго або двух на дзень кожны, да бацькі адсылала і кожны раз галава малайца падала і на кол узбівалася. Казала яна так: «Хто хоча, няхай прыйдзе да мяне і апавядае мне з навукі, чаго буду пытаць. Тады возьме мяне за сябе. А калі навукі не будзе ўмець і не адкажа на тое, што буду пытаць, тады галаву патраціць».

Маладзец прамову выслухаў і дзівіўся таму моцна. І мувіў да той пані:

— Ай, матка! З твайго дазвалення я да той каралеўны пайду, дыспутаваць паспрабую. Бо што на чале напісана, таго не мінеш. Калі пан Бог мне дапаможа дыспутаваць і адгадаць, вазьму яе за сябе. А калі ён мне не дапаможа, галаву пакіну.

— Для Бога, сынку, прашу цябе, дай той панне спокуй. Ні адна галава ад каралеўны не выйшла. Тая панна навукі не баіцца ў дыспуце, а на скарбы не спакуслівая, аніякіх жахаў не баіцца.

— Бывай, матка. Пайду я, бо хто смерці баіцца, той добра не адкажа.

— Няхай табе, сынку, пан Бог дапаможа, няхай твой верх будзе.

Маладзец да гаспадарскіх варот альбо да брамы прыйшоў. Спытаў пазвалення. Дазволілі пусціць малайца. Хутка вароты адчынілі. Маладзец пайшоў да гаспадара-караля і кажа:

— Пан гаспадар! Найяснейшы кароль, пан мой, ці дазволіш нам з найвышшаю каралеўнаю размову весці ў навуцы божай?

— Ой, маладзеча! На крывавую справу не ідзі, у суд галаву не нясі. Калі навукі не будзеш ведаць, тады галаву пакінеш.

— Добра, я на тое згаджаюся, і прашу вашай каралеўскай міластыні далажыць панне.

У той жа час панне далажылі. І прызвала яна малайца да сябе прыйсці. Слугі яго да панінага пакою правялі і паставілі за залатое крэсла. Маладзец сеў на тое крэсла, і панна твар свой паказала. Вельмі прыгожая яна была. Маладзец падумаў сабе: «Як буду на твар панны глядзець, тады розум памяшаецца, недарэчнасць учыню, не буду ведаць, што адказваць» і кажа:

— Ай, панна, схавай твар свой. У нашым законе пан Бог забараніў на белы твар глядзець. А тады навукі пытай.

— Я ў цябе першае слова пытаю,— панна кажа.— У чым сядзіш, маладзец?

— У сваіх штанах сяджу.

— Што без шаблі сячэ?

— Рыба ў моры. Тая рыба такая вялікая, як гара! Карабель заглынае, як масла.

— Хто ў магіле сорак дзён плакаў?

— Гэта Йунус-прарок. Калі яго рыба з´ела, тады ён у нутры рыбіным быў сорак дзён, у рыбе смуткаваў і плакаў.

— Хто дайшоў да магілы і смертнай мукі не меў?

— Гэта Аййуб-прарок. 18 год цяжка хварэў. Дзве тысячы чарвякоў цела яго елі, цяжкія мукі і болі цярпеў, таксама, як у гробе.

— Ай маладзеча! Чатыры асобы не ад маткі радзіліся. Хто такія?

— Гэта Адам, айцец наш. Другая — жонка яго і наша матка Ева. Трэці — Ісмайлаў баран, каторага пан Бог стварыў і на некалькі тысяч гадоў у раю схаваў для Ібрагіма. Чацвёрты — прароцкі вярблюд, называецца Саліх.

— Хто бязвінны здрадзіў і няпраўду казаў?

— Йусуфа браты здрадзілі. Прыйшлі да бацькі і казалі, што Йузека воўк з´еў.

— Што гэта за 12 людзей прыйшлі да горада Мясір, і з тых 12 — 6 тысяч стала?

— Гэта Йакуп з дванаццацю сынамі да Мясір-панства прыйшлі. А там людзі Йусуфа падыйшлі. Так іх 6 тысяч стала.

Да самага вечара маладзец апавядаў, ніводнай рэчы не пераблытаў. Панна і кажа:

— Сёння можаш ісці ад мяне, але назаўтра прыходзь, задам табе смутак.

— Той добры пан, які сёння дапамог, той і заўтра дапаможа.

Мададзец устаў з месца і ў радасці пайшоў да бабінай хаты. Баба сустрэла яго:

— Як ты, сынку, выйшаў адтуль? Мая душа з целам развіталася, пакуль цябе дачакалася.

— Чаго дзеўка ў мяне пыталася, тое і адказваў у малым часе слова ў слова.

У вялікай радасці лёг спаць, але сон яго не браў, паўночы не спаў, думаў... Назаўтра рана ўстаў, пану Богу хвалу аддаў і пайшоў яшчэ да палацу. Дазволена было яго пусціць. Маладзец прыйшоў да пакою, дзе панна ўжо задумала загадку.

— Паведай, што гэта за дрэва: дванаццаць галінак, на кожнай галінцы трыццаць лісткоў, сярэдзіна чорная, а верх белы?

— Гэта год і дванаццаць месяцаў у´годзе. І тое, што на кожнай галінцы 30 лісткоў — гэта ў месяцы 30 дзён, ноч чорная, а дзень белы.

— Што гэта за птушка: не нясецца і не плодзіцца аднолькава.

— Гэта год аднолькавы, не прыбывае і не адбывае.

— Паведай мне, маладзеч, у навуцы шмат птушак ёсць?

— Сем птушак у Каране пан Бог упамінае: сініца, скаўронак, голуб, пчолка, удот, салавей, жаўронак.

— Каму пан Бог прыроджаную навуку даў і той навукі ніхто не можа знайсці, а не тое, што авалодаць?

— Гэта пчолка прыроджаную навуку мае.

— Яшчэ дзве рэчы: што гэта за людзі няпраўду мувілі — да раю пайшлі, а другія людзі праўду мувілі — і да пекла пайшлі?

— Тыя людзі, каторыя няпраўду мувілі,— гэта Йусуфа браты. Йусуфа ў студні ўтапілі, бацьку мувілі: «Йусуфа воўк з´еў». Пазней перад Богам каяліся. Тады пан Бог пакаянне прыняў і тыя, каторыя праўду мувілі, да пекла пайшлі, на самой справе пайдуць першыя — хрысціяне, а другія — жыды. Хрысціяне мувілі на жыдоў: «Вы балваноў цалавалі», а жыды мувілі на хрысціян: «А вы і цяпер абразам і балванам кланяецеся». Тады яны абодва праўду мувілі і да пекла пайшлі.

— Паведай мне, маладзец, чортава як імя?

— Чортава імя Херыс. Як на небе быў, таго звалі Ібліс.

— Айцец наш Адам на тым свеце як шмат гадоў жыў?

— Тысячу гадоў не поўнасцю жыў.

— Як шмат разоў да Каабу хадзіў?

— 70 разоў у Каабу быў.

— Што гэта такое, што не мае ні месца, а ні полага і само сабе ахоту дае?

— Гэта вецер.

— Хто ўперад да пекла ідзе?

— Гэта Кабіл, каторы Габіла, брата, забіў.

— Ідзі сабе з Богам. Калі і раніцаю адкажаш, то будзеш шчасце мець.

Маладзец дзеўцы пакланіўся і пайшоў з Богам. Дзеўка вельмі засмучалася і дзівілася яго мудрасці і навуцы, бо такога нідзе не бачыла. І ў той вечар нічога не ела з вялікага смутку і цэлу ноч не спала.

**Пераклад і літаратурная апрацоўка Ю. Крыніцкага, студэнта-завочніка філалагічнага факультэта, І. Анікевіч.**

**(Працяг чытайце ў наступным нумары газеты).**

# НА ЭКРАНАХ КІНАТЭАТРАЎ ГОРАДА

**«Капытам сюды, капытам туды»**— гэта чэшская мастацкая стужка ўпершыню на нашым экране падымае праблему СНІДа, ад якога не застрахаваны ніводны чалавек, які вядзе разгульны спосаб жыцця. Тэма раскрываецца ў нечаканым ракурсе: перад намі — вясёлыя эратычныя прыгоды трох маладых людзей і іх сяброўак, якімі яны з задавальненнем мяняюцца, не задумваючыся аб выніках, пакуль адзін з герояў не падхапіў смертаносны вірус ад чужаземкі-наркаманкі. Бязвыхадная ў сваёй непазбежнасці трагедыя, нечакана абрушваецца на ўсю кампанію... Рэжысёр Вера Хіцілава паставіла свой новы фільм быццам бы на адным дыханні: вялікая доля іроніі і сарказму, калейдаскоп эратычных гульняў, які сімвалізуе свабоду ад усяго на свеце, «лятаючая» апаратарская камера, якая адкрывае нам дасціпнае відовішча распушчанасці,— усё гэта не засланяе пазнавальнага свету, у якім жывуць героі. Бяда, навісшая над імі, недзе зусім блізка — сцвярджае фільм. «Салодкае жыццё» нясе ў сабе пагрозу пакутлівай смерці, калі ўсё чалавецтва не спыніцца своечасова.

Кінасатыра — жанр, які выбралі аўтары новай стужкі **«Шапка»** (студыя «Жанр» пры «Мосфільме»). Стужка пастаўлена па аднаіменнай аповесці Уладзіміра Вайновіча рэжысёрам Канстанцінам Воінавым.

У пісьменніка Рахліна, які ўсё жыццё пісаў раманы аб простых, але гераічных савецкіх людзях, з´явілася магчымасць пашыць сабе новую футравую шапку ў кабінеце Саюза пісьменнікаў. На яго здзіўленне, згодна з пісьменніцкім «табелем аб рангах», Рахліну павінна была дастацца шапка... з ката сярэдняй пушыстасці, у той час як больш значным літаратарам — пыжыкавыя і андатравыя... Рахлін пачынае няроўную барацьбу з бюракратычнай машынай за права набыць «прэстыжную» шапку...

Развіццё падзей аказалася непрадказальным! У галоўных ролях — В. Ільін, Л. Федасеева-Шукшына, Я. Яўсцігнееў, А. Яфрэмаў, І. Уладзіміраў, В. Нявінны, А. Табакоў, А. Джыгарханян, Я. Жарыкаў, Л. Смірнова.

Амерыканская стужка **«Сэрца Анёла»** будзе сапраўднай загадкай для савецкіх гледачоў!

Прыватнага сышчыка Гары Ангела нейкі дзіўны пан наймае для расследавання абставін таемнага знікнення ў Новым Арлеане джазавага музыканта. Справа акружана страшнай тайнай! Тыя, хто скажа сышчыку адно слова аб справе, тут жа гінуць ад рук невядомага забойцы. І яшчэ — у гэтай гісторыі замешаны сам Д´ябал...

У ролях Роберт дэ Ніро, Мікі Рурк, Лайза Боне, Шарлота Рэмплінг.

Святам відовішчаў стане для гродзенцаў праграма амерыканскіх супербаевікоў, якія прадставіла аб´яднанне «Парытэт».

**«Шына — каралева джунгляў»**— гэта экзатычная стужка аб жанчыне-Тарзане.

**«Блакітная Лагуна»**— гісторыя кахання хлопца і дзяўчыны, якія яшчэ ў дзяцінстве аказаліся на бязлюдным востраве.

**«Дакладны ўдар»**— стужка пра футбол, у якой зняўся сам Пеле ў ролі нападаючага.

**«Усход чорнага месяца»**— гэта пагоня мафіі за супераўтамабілем.

Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшка, 22, пакой 404,
тэл. 44-72-97

Газета выходзіць штотыднёва

Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня
вул. Паліграфістаў, 4.

Зак. 8255.
2000 экз.

Рэдактар
Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ.